грамадства прысвечаны даследаванні ў галіне такіх дысцыплін П.л., як сацыялінгвістыка, тэорыя ўздзеяння, паліт. лінгвістыка, тэорыя рэкламы, а таксама прыкладныя даследаванні па арфаграфіі і арфаэпіі. Пытанні захавання і перапрацоўкі моўнай інфармацыі вырашаюць тэрміназнаўства і тэрмінаграфія, лексікаграфія, корпусная і палявая лінгвістыка. Шэраг дысцыплін П.л. займаецца аптымізацыяй кагнітыўнай функцыі мовы. Камп'ютарная лінгвістыка вырашае пытанні эфектыўнага ўзаемадзеяння паміж чалавекам і камп'ютарам (стварэнне сістэм апрацоўкі жывой мовы, інфармацыйна-пошукавых сістэм, электронных слоўнікаў, гіпертэкставых тэхналогій і інш.). *Псіхалінгвістыка* вывучае механізмы ўзнікнення і ўспрыняцця людзьмі маўлення. Квантытатыўная лінгвістыка даследуе мову пры дапамозе статыстычных метадаў, якія выкарыстоўваюцца, напр. пры дэшыфроўцы, экспертызе аўтарства тэксту, сінтаксічным парсінгу (аналізе). Акрамя таго, П.л. займаецца стварэннем міжнар. штучных моў, укараненнем лінгв. даследаванняў у медыцыну (нейралінгвістыка), транскрыпцыяй і транслітарацыяй геагр. назваў, распрацоўкай шляхоў навучання мове людзей з асаблівасцямі развіцця (сурда- і тыфлапедагогіка), вывучэннем паняццяў, што складаюць аснову фармальнага апарату для апісання жывых моў (матэматычная лінгвістыка) і інш.

*Літ.:* Плотнікаў Б.А. Агульнае мовазнаўства. Мінск, 1994; Рагаўцоў В.І. Агульнае мовазнаўства. Магілёў, 2007; Шилихина К.М. Основы прикладной лингвистики. Воронеж, 2006.

*С.У.Шахоўская.*

**ПРЫКМЕ́ТЫ**, жанр малой фальклорнай прозы, у якім увасобілася прадказанне пэўнага выніку на аснове прычынна-выніковай залежнасці з'яў, падзей, дзеянняў, пацверджанае нар. вопытам. Найчасцей П. былі звязаны з будучым надвор'ем, ураджаем, фіз. станам людзей і жывёл. Вял. роля ў фарміраванні П. належала назіранням за жывёльным і раслінным светам, з'явамі прыроды. Напр., з'яўленне вял. колькасці вавёрак у пэўнай мясцовасці было знакам на добры ўраджай; калі зіма была марозная, то летам чакалі засухі. Па раскаце грому меркавалі пра ўрадлівасць: «Калі першы ўдар грому з поўдня, то год будзе ўраджайны, калі з поўначы — галодны». З П. былі звязаны і прадказанні надвор'я: «Калі дровы весела гараць, то ўлетку гэта варожыць пагоду, а зімою — мароз», «Калі дрэмлецца і пазёўваецца, будзе дождж» і інш. П. суправаджалі ўсю дзейнасць чалавека. Калі разглядаць П. з пункту гледжання іх практычнай каштоўнасці, то толькі нязначная іх частка можа мець сёння рэальную цікавасць (земляробчыя, гасп. назіранні). Аднак многія з іх маюць пазнавальнае значэнне, раскрываюць нар. ўяўленні і вераванні, складаны светапогляд беларуса, яго веданне жыцця і прыроды, выяўляюць невычэрпную фантазію народа.

*Літ.:* Беларуская вусна-паэтычная творчасць. Мінск, 2000.

*А.М.Аляхновіч.*

**ПРЫЛУ́ЦКАЯ ПАКРО́ЎСКАЯ ЦАРКВА**, помнік архітэктуры драўлянага дойлідства ў в. Прылукі Брэсцкага р-на. Пабудавана ў 1870. Да прамавугольнага ў плане асн. аб'ёму пад 2-схільным дахам з цыбулепадобнай галоўкай прымыкаюць 2-ярусная (васьмярык на чацверыку) шатровая званіца з макаўкай, да алтарнай часткі — апсіда з рызніцай. Фасады вертыкальна ашаляваны і прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі ў разных ліштвах. Уваход вылучаны 2-слупавым ганкам пад 2-схільным пакрыццём. У інтэр'еры абразы «Хрышчэнне Хрыста і Маці Божая Замілаванне», «Мікалай Цудатворац», «Праабражэнне», «Адзігітрыя» (17—18 ст.). Храм унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Царква дзейнічае.

**ПРЫЛУ́ЦКІ ПАЛА́ЦАВА-ПАРКАВЫ КО́МПЛЕКС**, помнік архітэктуры і садова-паркавага мастацтва 2-й пал. 18 — 19 ст. ў в. Прылукі Мінскага р-на. Закладзены на месцы б. манастыра 17 ст. (існаваў да 1740). Уключае палац і парк. Мураваны палац пабудаваны ў 1-й пал. 19 ст., рэканструяваны ў 1851, пасля пажару 1868 аднаўлены ў 1872; значна пашкоджаны ў Вял. Айч. вайну, адбудаваны ў 1950-я гг. Першапачаткова ўяўляў сабой кампактнае прамавугольнае ў плане 2-павярховае збудаванне з нізкім цокальным паверхам у стылі несапраўднай готыкі. Цэнтр. 3-павярховы рызаліт з гранёным эркерам на



*Прылуцкая Пакроўская царква.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ